Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 МАЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 90 (27948) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**На выхадныя магчымы замаразкі**

СТАР. 3



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Фальклорная вандроўка ў Курыцічы**

СТАР. 5

■ Сёння — Дзень сям'і



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Трымайце шчасце ў руках!

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Дзяржаўная падтрымка сям'і заўсёды з'яўлялася ключавым напрамкам сацыяльнай палітыкі. Інвестыцыі ў сям'ю, ва ўмацаванне гэтага сацыяльнага інстытута — інвестыцыі ў сучаснасць і будучыню нашай краіны, у развіццё чалавечага патэнцыялу беларускага грамадства. Калі дзеці растуць у духоўна моцнай, згуртаванай сям'і, будзе больш моцнай і стабільнай дзяржава».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.05.2015 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 14180,00 ▲ |
| Еўра | 16180,00 ▲ |
| Рас. руб. | 283,00 ▼ |
| Укр. грыўня | 690,02 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Інтэграцыя ў адукацыі

# ПРАЦЭС ПАЙШОЎ...

## Перад вышэйшай школай адкрываюцца новыя магчымасці

**Учора з Арменіі прыйшла доўгачаканая навіна — на канферэнцыі міністраў адукацыі краін агульнаеўрапейскай прасторы была ўхвалена заяўка Беларусі на яе ўключэнне ў Балонскі працэс. Нашу дэлегацыю ў Ерэване ўзначаліў міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў.**

— Рашэнне аб уключэнні нас у еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі адлюстроўвае прызнанне сусветнай грамадскасцю беларускай сістэмы вышэйшай адукацыі і пацвярджае той факт, што нацыянальная мадэль — канкурэнтаздольная і зможа інтэгравацца ў сусветную адукацыйную прастору. Для Беларусі — гэта важны і адказны крок, які ставіць перад намі велізарныя задачы па развіцці і абнаўленні нацыянальнай сістэмы адукацыі, — упэўнены Міхаіл Жураўкоў.

Балонскі працэс — працэс збліжэння і гарманізацыі сістэм адукацыі краін Еўропы. У сакавіку Беларусь наведала дэлегацыя экспертаў Савета Еўропы па адукацыі з мэтай ацаніць гатоўнасць вышэйшай школы Беларусі прытрымлівацца агульнаеўрапейскіх адукацыйных каштоўнасцей і прынцыпаў Балонскай сістэмы. У еўрапейскіх экспертаў было шмат пытанняў. Іх цікавілі, напрыклад, перспектывы ўкаранення крэдытнай сістэмы (ECTS) у беларускіх ВНУ, якая з'яўляецца галоўным інструментам акадэмічнай мабільнасці студэнтаў. Ці ёсць у планах міністэрства намер даць універсітэтам больш паўнамоцтвы ў вызначэнні сваёй адукацыйнай палітыкі? Магчымасці студэнтаў аб'ядноўвацца ў асацыяцыі, каб уплываць на працэсы, што адбываюцца ва ўніверсітэтах, у тым ліку і на якасць адукацыі... Такім чынам, відавочна, што проста касметычным рэфармаваннем вышэйшай школы нам не абысціся, калі мы і сапраўды збіраемся ўліцца ў агульнаеўрапейскую прастору. І ні ў якім разе ўступленне краіны ў Балонскі працэс нельга разглядаць выключна як магчымасць атрымаць дыплом еўрапейскага ўзору.

СТАР. 3

■ Дайце рады!

# Тры шляхі для гультаёў,

## або Як не трапіць на «дошку ганьбы»

**У Віцебскім раёне нямала тых, каму дапамаглі пачаць жыццё, як кажуць, «з чыстага ліста». Так, падчас камандзіроўкі ў вёску Яроміна я пазнаёміўся з жанчынай, якая, каб вярнуць дзіця, без кадзіравання кінула піць. «Спрацаваў» мацярынскі інстынкт, «цуд»? Упэўнены, што калі б жанчыну не пазбавілі бацькоўскіх правоў, наўрад ці жыццё наладзілася б. На яе прыкладзе можна канстатаваць эфектыўнасць працы па «перакоўцы» гультаёў.**

### НАГЛЯДАЮЦЬ, ЯК ЗА ДЗЕЦЬМІ...

— Усяго ў раёне каля 270 «праблемных грамадзян». Усе яны ў нас на кантролі. Не даём гультаям спакойнага жыцця. Спачатку высвятляем: за кошт чаго чалавек жыве, адкуль грошы на выпіўку. Бачым на вуліцы ў нецвярозым стане, складаем пратаколы, папярэджваем, выклікаем на пасяджэнні савета прафілактыкі. Некалькі разоў на тыдзень участковы прыходзіць на месца іх працы, параленьна правярае, ці працягваюць піць дома. Вядома, у калектывах уважліва сочаць за тым, як перавыхоўваюцца гультаі. Калі што не так, адразу нам сігналізуюць пра спазненне, прагул. Калі добраахвотна не хоча працаваць, адпраўляем у лячэбна-працоўны прафілакторый, — расказвае **Андрэй АБУШКЕВІЧ, намеснік начальніка аддзела ўнутраных спраў Віцебскага раёна, падпалкоўнік міліцыі.**



СТАР. 4

# Захаваць прафесіяналаў

**Прэзідэнт запатрабаваў ад урада зрабіць усё магчымае і немагчымае для захавання кваліфікаваных кадраў на рынку працы**

**Учора Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па бягучай сітуацыі на рынку працы і сацыяльнай абароне насельніцтва.**

На нарадзе прадметна разглядалася сітуацыя на рынку працы краіны, паведамляе БЕЛТА. «Гэтая тэма асабліва актуальная, паколькі закранае інтарэсы многіх людзей і ўплывае на стабільнасць грамадства і дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што яму дакладваюць пра трывожныя тэндэнцыі ў гэтай сферы. «Скарачаецца колькасць занятага насельніцтва, ды і няпоўная занятасць расце», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў прысутным, і асабліва ўраду, аб першараднай задачы: «Як бы ні было цяжка, неабходна захаваць кваліфікаваныя кадры. Для гэтага трэба зрабіць не толькі ўсё магчымае, але і немагчымае». Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад удзельнікаў нарады аб'ектыўнай ацэнкі існуючай сітуацыі, весці размову па сутнасці, не адыходзячы ад вострых пытанняў. «Неабходна выявіць сапраўдныя прычыны працсаў, што адбываюцца, і выпрацаваць меры неадкладнага рэагавання», — паставіў задачу Прэзідэнт.

«Мы не можам дапусціць сацыяльнай напружанасці ў грамадстве і ў працоўных калектывах. Гэта найважнейшая задача ўрада, органаў улады на месцах. Справа не ў сацыяльнай напружанасці. Справа ў тым, што кожны чалавек павінен мець права на працу, магчымасць атрымаць гэтую працу як сродак даходаў, каб утрымліваць сям'ю. Вось і ўся праблема», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнту было даложана аб прычынах узнікнення праблем, аб тым, што перашкаджае іх вырашэнню, і галоўнае, аб мерах, якія неабходна прыняць для забеспячэння занятасці і стабільнасці на рынку працы.

Вывучэннем сітуацыі ў рэгіёнах займалася маніторынгавая група. На нарадзе было прадстаўлена бачанне прычын негатыўных з'яў.

Кіраўніку дзяржавы далажылі, што сітуацыя на рынку працы ў Беларусі кіруемая і даволі стабільная. Прынятыя раней і прымаемыя зараз меры даюць магчымасць утрымліваць беспрацоўе ў сацыяльна прымальных межах, а таксама забяспечваць неабходныя гарантыі і кампенсацыю насельніцтву. У немалой ступені на ўзровень беспрацоўя паўплывала прынятае ў красавіку 2015 года дэкрэта аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства. Пэўны ўплыў аказвае і знешняя працоўная міграцыя. Так, у 2014 годзе паток працоўных мігрантаў з Украіны павялічыўся ў 3 разы і склаў амаль 18 тысяч чалавек. У асноўным яны былі ўладкаваны на рабочых спецыяльнасцях. Сітуацыя на рынку працы ў гэтай часткі знаходзіцца пад кантролем.

Разам з тым пад уздзеяннем знешніх крызісных фактараў сфарміраваліся негатыўныя тэндэнцыі ў эканоміцы. Пераважная большасць прадпрыемстваў знаходзіць выйсце са становішча, спраўляецца з крызіснымі з'явамі ўласнымі сіламі. Аднак на шэрагу прадпрыемстваў, пераважна ў прамысловай і будаўнічай галінах, сітуацыя больш складаная.

***

Захаванне працоўных калектываў — адна з асноўных задач, якія стаяць сёння перад урадам, мясцовымі ўладамі, кіраўнікамі прадпрыемстваў, сказала журналістам пасля нарады намеснік прэм'ер-міністра Наталля Качанава. «У аснове павінен быць чалавек. Разглядаючы пытанні занятасці, у першую чаргу неабходна не дапусціць таго, каб людзі заставаліся без працы».

Залогам гэтага служыць стабільная і эфектыўная работа прадпрыемстваў, якія павінны выпускаць канкурэнтаздольную прадукцыю, дыверсіфікаваць рынкі збыту, працаваць над змяншэннем дэбіторскай запазычанасці і зніжэннем затрат. «У сувязі з гэтым кіраўнікі прадпрыемстваў павінны прымаць сур'ёзныя рашэнні, каб тыя працавалі стабільна і без збояў», — лічыць яна.

Віцэ-прэм'ер па даручэнні кіраўніка дзяржавы наведала шэраг прадпрыемстваў, у тым ліку Мінскі трактарны завод, паразмаўляла з працоўнымі калектывамі. Сітуацыю на МТЗ Наталля Качанава ацэньвае як стабільную. «Сёння прадпрыемства працуе ў дзве змены. Важна, каб гэтая стабільнасць захоўвалася, каб былі работа, прадукцыя», — сказала яна, дадаўшы, што на гэтым і іншых прамысловых прадпрыемствах не абыходзіцца без праблем. «Кіраўнікі імі займаюцца, і ад аператыўнасці, эфектыўнасці прынятых мер залежаць эканамічныя поспехі, а значыць, і стабільнасць працоўных калектываў», — рэзюмавала намеснік прэм'ер-міністра.

---

■ Выбары-2015

Лідзія ЯРМОШЫНА:

# «Змяненняў у выбарчым заканадаўстве ў найбліжэйшы час не будзе»

**Цэнтрвыбаркам рэкамендуе камісіям шукаць сродкі на празрыстыя скрыні. Пра гэта, а таксама пра некаторыя асаблівасці падрыхтоўкі будучай выбарчай кампаніі расказала на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў яе старшыня Лідзія ЯРМОШЫНА.**

## ПАДРУЧНІКІ ДЛЯ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ

«Правядзенне пасяджэння да прызначэння даты выбараў — гэта звычайная практыка, — адзначыла Лідзія Ярмошына і патлумачыла: — Справа ў тым, што мы рыхтуем для выбараў два падручнікі. Гэта дапаможнікі для тэрытарыяльных і ўчастковых камісій. Тыя падручнікі не прывязаны да даты выбараў. Але гэта аб'ёмныя тэксты, якія патрэбны ўжо на наступны дзень пасля прызначэння даты выбараў».

Лідзія Ярмошына таксама паведаміла, што на выбарах будуць працаваць 155 тэрытарыяльных выбарчых камісій. Яны будуць створаны не пазней чым за 80 дзён да выбараў. Тэрмін іх паўнамоцтваў заканчваецца пасля апублікавання вынікаў выбараў. Такім чынам, камісіі будуць працаваць прыкладна 85 дзён.

## БЕЗ ПАШПАРТА — НЕ ВЫБАРШЧЫК

Як запэўніла старшыня Цэнтральнай камісіі, грамадзяне Расіі, што выпадкова трапілі ў спісы выбаршчыкаў, усё роўна не змогуць прагаласаваць на прэзідэнцкіх выбарах. Лідзія Ярмошына пацвердзіла, што здараюцца такія выпадкі, калі запрашэнне ўдзельнічаць у галасаванні атрымліваюць грамадзяне Расіі, якія маюць права ўдзельнічаць у мясцовых выбарах. «Але грамадзяне Расіі, як і грамадзяне Украіны, выдатна ведаюць, што яны не могуць галасаваць на прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі. На ўчастку ім усё роўна не дадуць прагаласаваць, таму што ў іх няма пашпарта грамадзяніна Беларусі», — сказала Лідзія Ярмошына.

У той жа час яна адзначыла, што падобныя памылковыя запрашэнні «адмоўна адбіваюцца на іміджы выбарчай кампаніі». З гэтай прычыны ЦВК будзе заклікаць тэрытарыяльныя камісіі максімальна ўважліва правяраць спісы.

Лідзія Ярмошына таксама ўдакладніла, што на прэзідэнцкія выбары, калі яны пройдуць у адзін тур, плануецца выдаткаваць 180 млрд рублёў. Большая частка гэтых сродкаў пойдзе на зарплату супрацоўнікаў выбарчых камісій і толькі менш за 20% — на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне.

Што тычыцца празрыстых скрынь, то кіраўнік ЦВК у чарговы раз нагадала: у беларускім заканадаўстве няма абавязковага патрабавання на гэты конт, але Цэнтрвыбаркам усё роўна рэкамендуе камісіям шукаць сродкі на празрыстыя скрыні. Як чакаецца, яны будуць выкарыстоўвацца ў асноўным у гарадах.

## У БУДУЧЫНІ ПРЭЗІДЭНТАМ КРАІНЫ МОЖА СТАЦЬ ЖАНЧЫНА

Лідзія Ярмошына не выключае, што ў будучыні Прэзідэнтам Беларусі можа стаць жанчына. Адказваючы на пытанне журналістаў наконт яе адносін да таго, што ў будучых прэзідэнцкіх выбарах збіраюцца ўдзельнічаць некаторыя жанчыны, Лідзія Ярмошына адзначыла, што ставіцца да гэтага станоўча. На яе думку, гэтым прэтэндэнткам трэба абавязкова прыкласці намаганні для таго, каб атрымаць статус кандыдатаў.

Гаворачы пра некаторыя новаўвядзенні будучых выбараў, Лідзія Ярмошына нагадала, што на гэты раз кандыдаты будуць выкарыстоўваць для агітацыйнай кампаніі свае фонды, памер якіх дазволілі павялічыць з 3 да 9 тысяч базавых велічынь. Прычым фарміраваць іх можна будзе ўжо з моманту стварэння ініцыятыўных груп. Гэта дасць магчымасць прэтэндэнтам у кандыдаты на прэзідэнцкі пост легальна расплачвацца са сваімі актывістамі.

Што да назіральнікаў, то запрашэнні пакуль не перадаваліся, бо яшчэ не вызначана дата выбараў. Аднак, улічваючы абавязкі Беларусі перад СНД і АБСЕ, варта чакаць на выбарах назіральнікаў ад гэтых міжнародных арганізацый. Якіх-небудзь змяненняў у выбарчым заканадаўстве ў найбліжэйшы час не прадугледжваецца, бо гэта будзе супярэчыць рэкамендацыям АБСЕ і Венецыянскай камісіі Савета Еўропы. Гэтыя арганізацыі раяць, каб заканадаўства змянялася не пазней чым за год да выбараў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ** ■

---

■ Сацыяльны клопат

## БАЦЬКОЎСКАЕ ЦЯПЛО ДЛЯ КОЖНАГА

**Больш за 17,7 тысячы дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, выхоўваюцца ў замяшчальных сем'ях розных тыпаў. Пра гэта паведаміла дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Наталля ПАСПЕЛАВА.**

Так, 9 740 дзяцей выхоўваюцца ў апякунскіх сем'ях, каля 2 тысяч — у 243 дзіцячых дамах сямейнага тыпу, больш за 500 — у дзіцячых вёсках і мястэчках, каля 7 тысяч — у сем'ях усынавіцеляў. У дзіцячых інтэрнатных установах рознай ведамаснай прыналежнасці жывуць крыху больш за 4 тысячы дзяцей.

Тым часам у 2014 годзе больш за 560 дзяцей-сірот усынавілі беларускія сем'і, 110 — італьянскія. Міжнароднае ўсынаўленне праходзіць у асноўным у дачыненні да няпоўнагадовых ва ўзросце 14,5 года, нацыянальнае — у дачыненні да дзяцей ва ўзросце да 7-8 гадоў. Усяго ў Беларусі ў сем'ях усынавіцеляў выхоўваецца каля 7 тысяч дзяцей. З кожным годам колькасць тых, якія падлягаюць усынаўленню, памяншаецца. Змяняецца і іх узрост: практычна няма малых, якіх можна ўсынавіць, у асноўным гэта хлопчыкі і дзяўчынкі, старэйшыя за 3 гады.

«За перыяд дзеяння дэкрэта №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у сацыяльна неўладкаваных сем'ях» амаль 59% дзяцей вернуты бацькам. Па рашэнні суда за 2014 год аднаўлены ў бацькоўскіх правах 221 бацька і маці, яны вярнулі дадому, у родную сям'ю, 289 дзяцей», — удакладніла спецыяліст.

Сёлета ў кастрычніку ў Беларусі плануецца правесці першы форум замяшчальных сем'яў. На ім будзе прэзентаваны перадавы вопыт выхавання дзяцей, прадастаўлена магчымасць агучыць існуючыя праблемы, атрымаць дапамогу кваліфікаваных спецыялістаў. Апроч таго, у найбліжэйшыя месяцы адбудзецца першы ў Беларусі фестываль сем'яў-усынавіцеляў. Ён пройдзе ў агрaсядзібе ў Валожынскім раёне. Падчас яго будуць прэзентаваны новыя тэхналогіі суправаджэння сем'яў — цэлы спектр сацыяльна-педагагічных і сацыяльна-псіхалагічных паслуг.

## ЛЕТА БУДЗЕ КАРЫСНЫМ

**Адразу пасля завяршэння навучальнага года ў Мінску стартуе аздараўленчая кампанія. Сёлета яна пройдзе пад дэвізам «Лета на карысць», пра што паведаміла начальнік аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Ганна РЫСЯВЕЦ.**

«Усе мерапрыемствы, якія адбудуцца на канікулах у дзіцячых лагерах, будуць накіраваныя на фарміраванне новых навыкаў у дзяцей. Напрыклад, у ходзе праекта «Ваш выбар» спецыялісты распавядаюць дзецям пра шкодны ўплыў на здароўе курэння, ужывання алкаголю, наркотыкаў, фарміруюць у падлеткаў адказнасць за сваё здароўе», — распавяла начальнік аддзела.

Гэтым летам больш як 61,6 тысячы юных мінчан пройдуць аздараўленне ў 35 дзіцячых загарадных лагерах з кругласутачным знаходжаннем, у 350 лагерах з дзённым знаходжаннем і ў 200 палатачных і профільных лагерах.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК** ■

---

## ВЕЖА АЖЫВЕ

**Вежа ў цэнтры Гомельскага парку, з вяршыні якой на працягу многіх гадоў гамяльчане любаваліся краявідамі, зноў стане даступнай пасля васьмігадовага перапынку.**



З прычыны аварыйнага становішча ў 2007 годзе аб'ект быў закрыты для наведвальнікаў. Між іншым, гэтая гістарычная славутасць у першай палове XIX стагоддзя служыла трубой цукроваго завода князёў Паскевічаў, а ў савецкі час стала папулярным паркавым аб'ектам.

— У найбліжэйшыя дні пачнуцца рамонтныя работы, — паведаміў **генеральны дырэктар Гомельскага палаца-паркавага ансамбля Аляксандр ГОСЦЕЎ**. Падчас рэканструкцыі будзе аднаўлены цагляны мур вежы, цалкам заменена металічная вітая лесвіца, на назіральнай пляцоўцы ўсталююць новую агароджу. Акрамя таго, вежу плануюць абсталяваць асвятляльнымі прыборамі як звонку, так і ўнутры. Калісці турысты падніmaліся да назіральнай пляцоўкі па вінтавой лесвіцы амаль у поўнай цемры.

Паводле праектна-каштарыснай дакументацыі, на рэканструкцыю будзе накіравана каля Br1,5 млрд са сродкаў абласнога бюджэту. У верасні аб'ект культуры плануюць адкрыць для наведвальнікаў. З часам на назіральнай пляцоўцы на вышыні 42 метраў усталююць некалькі аптычных прыбораў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

---


РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Будь вместе с нами и выигрывай море призов и поездку в Дубай»

**1. Организатор:**
Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «РЛК Групп», зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191303156, свидетельство о регистрации юридических лиц выдано Минским горисполкомом 19 мая 2010 г.; юридический адрес: Республика Беларусь, 220089, г. Минск, пр. Дзержинского 57, пом. 51-7, УНП 191303156

**2. Наименование Рекламной игры:**
«Будь вместе с нами и выигрывай море призов и поездку в Дубай».

**3. Срок начала и окончания рекламной игры:**
С 17 марта 2015 г. по 20 мая 2015 г.

**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры:**
Свидетельство № 2524 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 13 марта 2015 г., выданное Министерством торговли Республики Беларусь.

**5. Сведения о количестве участников рекламной игры:**
В рекламной игре принято участие 26 человек

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда:**
Призовой фонд Рекламной игры по всем призам разыгран в полном обьеме

**7. Фамилию, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши):**

| | |
|---|---|
| **1. Путевка в Дубай на 2-х человек** | Сидорович В.И. |
| **2. Фильтр для воды обратного осмоса RO-4-NLLight** | Лесун А.С. |
| | Семенюк С.А. |
| | Власов А.Н. |
| | Вороняев Е.В. |
| | Писарев О.Л. |
| | Корикова Г.Г. |
| | Макутин Г.В. |
| | Михаленко А.Г. |
| | Лопатко С.В. |
| | Тарасеня Ю.С. |
| **3. Фильтр для душа с засыпкой нанокластеры** | Чернявская О.Н. |
| | Заватская Т.Г. |
| | Пинчук А.П. |
| | Сергеенко Е.И. |
| | Нечай Ж.П. |
| | Агарок В.Н. |
| | Нарубай Т.А. |
| | Мандрик Е.В. |
| | Наумова Н.Ю. |
| | Жукова С.П. |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры 390-06-16.**

■ Надвор'е

# ДАЖДЖЫ І НАВАТ НАВАЛЬНІЦЫ

## А на выхадныя ўначы магчымы замаразкі

**Сёння на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць халодная і няўстойлівая паветраная маса з боку Балтыйскага мора, пра што паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

Таму ў пятніцу на большай частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах — навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 11-17 цяпла. Захаваецца халоднае надвор'е і ў выхадныя. У суботу пераважна па паўночным усходзе пройдуць непрацяглыя дажджы, а ўдзень магчымы і навальніцы. Амаль паўсюдна па краіне ўдзень узмоцніцца вецер парывамі да 15-17 м/с. Тэмпература паветра ўначы на суботу знізіцца да 2-7 цяпла, а па паўднёвым захадзе месцамі магчымы замаразкі да 0 — мінус 3 градусаў. Удзень у суботу будзе плюс 9-15 градусаў, а ў Брэсцкай вобласці — да 17 цяпла. У нядзелю ўначы месцамі, а ўдзень паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы і часам навальніцы. Пры навальніцах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15-17 м/с. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю складзе ад 2 цяпла па паўночным усходзе да плюс 9 градусаў па захадзе краіны. У паўночна-ўсходніх раёнах уначы месцамі замаразкі да мінус 3 градусаў. Удзень будзе толькі 9-15 цяпла, а па паўднёвым усходзе — да плюс 17 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у нас будзе халадна і ў пачатку наступнага тыдня. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак складзе ад 2 да 7 цяпла, удзень — плюс 8-15 градусаў.

**Увага! Магнітныя буры**

Гэты тыдзень стаў сапраўдным выпрабаваннем для здароўя метэаадчувальных людзей. Дзве магнітныя буры мы ўжо перажылі, яшчэ адна накрые нас сёння, а наступная чакаецца ў панядзелак. У гэтыя дні метэазалежным людзям варта звярнуць асаблівую ўвагу на сваё самаадчуванне. Нагадаю, што цяпер навукоўцыназіраюць самую высокую сонечную актыўнасць за апошнюю тысячу гадоў. На Зямлі такія з'явы небяспечныя, напрыклад, для ліній электраперадач, газаправодаў і ў зоне моцных электратокаў.

Падчас павышанай сонечнай актыўнасці частка жыхароў планеты адчувае на сабе негатыўны ўплыў Сонца. Каб яго зменшыць, спецыялісты раяць пазбягаць канфліктных сітуацый, паколькі дадатковы стрэс дрэнна адбіваецца на стане здароўя, а таксама па магчымасці лепш адмовіцца ад паездак у метро, дзе моцнае электрамагнітнае поле. Медыкі рэкамендуюць устрымацца ад цяжкай ежы і пераядання, устрымацца ад алкагольных напояў, не парушаць рэжым дня і адмовіцца ад цяжкіх фізічных нагрузак.

Цяпер і для Беларусі моцныя магнітныя буры ўжо не жартачкі. Нагадаю, што ўначы з 17 на 18 сакавіка ў некаторых абласцях Беларусі і Расіі можна было назіраць унікальную прыродную з'яву для сярэдніх шырот — палярнае ззянне. Як растлумачылі навукоўцы, прычына яго з'яўлення так далёка ад палярнага круга тлумачыцца вельмі моцнай за апошнія паўтара года сонечнай бурай.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

# ПРАЦЭС ПАЙШОЎ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

IX канферэнцыя міністраў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі і IV форум па Балонскай палітыцы ўпершыню праходзяць у Арменіі. Нашы партнёры па ЕАЭС далучыліся да Балонскага працэсу дзесяць гадоў таму, але рэфармаванне вышэйшай школы ў гэтай краіне ўсё яшчэ працягваецца. Арменія перайшла на трохступеньчатую сістэму вышэйшай школы (бакалаўрыят—аспірантура—магістратура), увяла сістэму назапашвання і трансферу крэдытаў, інстытуты кантролю якасці, вучэбныя праграмы былі пераарыентаваны на модульнасць. Пашыраецца аўтаномія студэнтаў і іх удзел у працэсе прыняцця рашэнняў на ўзроўні ВНУ. Разам з тым, вышэйшая школа Арменіі сутыкнулася і з шэрагам праблем...

«Балонскі працэс — гэта скарбонка ідэй, з якой трэба браць толькі тое, што падыходзіць канкрэтнай краіне. Сёння і свет, і Еўропа прапануюць вялікія магчымасці, аднак, рухаючыся ў рэчышчы інтэграцыйных працэсаў, важна не страціць сваю нацыянальную ідэнтычнасць», — заявіў падчас свайго візіту ў Беларусь міністр адукацыі і навукі Рэспублікі Арменія Армен Ашацян.

**Ні ў якім разе ўступленне краіны ў Балонскі працэс нельга разглядаць выключна як магчымасць атрымаць дыплом еўрапейскага ўзору.**

На канферэнцыю ў Ерэван былі запрошаны прадстаўнікі 47 краін — удзельніц Балонскага працэсу. А сімвалам мерапрыемства стаў гранат, які складаецца з часцінак-зярнак. Падчас канферэнцыі чакаецца падпісанне найважнейшых дакументаў, якія вызначаць лёс тысяч студэнтаў і навучальных установ па ўсёй Еўропе. Будуць абмеркаваны Ерэванская дэкларацыя, а таксама важныя навапрыведзенні ў сферы адукацыі. Беларусь, як удзельнік Балонскай канвенцыі, таксама выкажа сваю думку па ўсіх пытаннях, што разглядаюцца ў Ерэване.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Прызыў-2015

# АРМІЯ ЯК ШКОЛА ЖЫЦЦЯ

## Каля 10 тысяч юнакоў гэтай вясной папоўняць армейскія шэрагі краіны

**Пачалася адпраўка новага папаўнення ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Беларусі. Першымі надзелі пагоны і абулі боты прадстаўнікі элітных войскаў — сіл спецыяльных аперацый Узброеных Сіл, роты ганаровай варты, механізаваных злучэнняў і войскаў сувязі. Неўзабаве да іх далучацца яшчэ некалькі тысяч будучых абаронцаў Айчыны — і войскі будуць поўнасцю ўкамплектаваны.**



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Прызыўніка Віталя ПЛЫТКЕВІЧА прыйшлі правесці маці і бабуля.

Апошнія зборы ў ваенкаматах — і прывітанне, новае жыццё! З якім настроем успрымаюць яго без пяці хвілін салдаты, карэспандэнты «Звязды» даведаліся падчас адпраўкі ў войскі, якая адбылася ўчора ў Мінскім гарадскім ваенным камісарыяце.

Мінчанін Максім Міхайлюк да армейскай службы рыхтаваўся і маральна, і фізічна. Спартыўная падрыхтоўка яму сапраўды спатрэбіцца: служыць юнак будзе ў Маладзечне, у 14-м асобным палку ўрадавай сувязі КДБ. Маральна настройваюць родныя: маўляў, ёсць на каго раўняцца. І праўда, ёсць. Дзядуля, Барыс Леанідавіч Русановіч, — ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Меў узнагароды, якія атрымаў за бездакорнае ваеннае авіятэхнікі.

У сённяшніх вайскоўцаў — іншыя, але не менш адказныя задачы. На службу настройваюць сябры і родныя, якія прыйшлі падтрымаць сваіх будучых абаронцаў. У акружэнні любімых маці і бабулі Віталю Плыткевічу, здавалася, нічога не страшна. Служыць будзе ў Калодзішчах — сувязістам. Як прызнаецца юнак, усё заканамерна: сувязістамі ў арміі былі і бацька, і дзядуля.

— Не здзіўлюся, калі і малодшы сын працягне такую своеасаблівую дынастыю, — кажа Алена Аляксандраўна, маці прызыўніка. — А тое, што ў армію пойдзе, — дакладна: невыпадкова ж нарадзіўся ў Дзень паветрана-дэсантных войск! Вядома, не да жартаў: як і ў кожнай маці, перажыванні ёсць. Але супакойваю сябе тым, што кожны сапраўдны мужчына павінен прайсці гэтую школу жыцця пад назвай армія.

«Ён у нас займаецца спортам, таму я за яго спакойная», — сказала як адрэзала бабуля юнака Таццяна Уладзіміраўна. Віталь упэўнены, што за добрую службу яго будуць адпускаць у звальненні, і тады ён зможа часцей бачыцца са сваёй сям'ёй.

У першы дзень адпраўкі ў войскі было накіравана каля тысячы прызыўнікоў, у тым ліку з Мінска і Мінскай вобласці — каля 300. Усяго на ўкамплектаванне Узброеных Сіл, іншых войск і воінскіх фарміраванняў нашай краіны сёлета плануецца адправіць каля 10 тысяч чалавек. Акрамя таго, каля тысячы — для праходжання службы ў рэзерве.

— Другі год запар мы практыкуем прызыў грамадзян на службу ў рэзерве, у тым ліку і вясной, — падкрэсліў **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела прызыву на вайсковую службу галоўнага арганізацыйна-мабілізацыйнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл Беларусі палкоўнік Андрэй МУРАШОЎ**. — Па-першае, гэта звязана з неабходнасцю падрыхтоўкі пэўных воінскіх спецыялістаў. Па-другое, у нашай краіне пакуль дастатковая колькасць прызыўнікоў, сярод якіх ёсць і тыя, якія не запатрабаваны пры камплектаванні тэрміновай службы. Таму ім прапаноўваецца такі від выканання воінскага абавязку, як служба ў рэзерве. Такім чынам, мы імкнёмся выкарыстоўваць як існуючыя прызыўныя рэсурсы, так і ажыццяўляць падрыхтоўку неабходных спецыялістаў для Узброеных Сіл.

Аляксей Пахомаў — будучы дэсантнік. Службу будзе праходзіць у 5-й асобнай брыгадзе спецыяльнага прызначэння. У элітныя войскі юнак хацеў трапіць свядома. «Калі служыць, дык там, дзе можна многаму навучыцца, — лічыць мінчанін. — Здаецца, што з арміі прыйду зусім іншым чалавекам».

Спецназаўцам будзе і Яўген Лагойка са Стоўбцаў. Цяжкасцей не баіцца, юнака хвалюе іншае: дома застаецца дзяўчына. Дар'я, якая прыехала правесці каханага, прызнаецца, што будзе чакаць. «Якраз закончу вучыцца, а потым і замуж можна выходзіць», — здаецца, усур'ёз гаворыць яна.

— Настрой моладзі мяняецца, — заўважае **палкоўнік у адстаўцы Валерый ДЗЕМЧАНКА**, які ўжо каторы год запар праходзіць падтрымаць прызыўнікоў. — Юнакі разумеюць, наколькі важна адслужыць у арміі. У грамадстве цябе паважаюць, на працу ўладкавацца не праблема, ды і дзяўчаты па-іншаму пачынаюць на цябе глядзець. Армія з'яўляецца пэўным трамплінам ва ўсіх пачынаннях.

Прызыўная кампанія — на стадыі завяршэння. Прызыўнымі камісіямі гарадоў і раёнаў у дачыненні да грамадзян ужо прынята больш чым 41 тысяча рашэнняў. Прадстаўлена каля 27 тысяч адтэрміновак, большую частку з якіх — амаль 72% — складаюць адтэрміноўкі для працягу адукацыі. Акрамя таго, некаторыя грамадзяне атрымалі адтэрміноўкі па стане здароўя, сямейных абставінах і для набыцця ваенна-тэхнічных спецыяльнасцей.

**Веранiка КАНЮТА**

■

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703** |
| Продавец | **ОАО «Гроднооблавтотранс». Филиал «Грузовой автомобильный парк № 2 г. Гродно» ОАО «Гроднооблавтотранс», г. Гродно, ул. Пучкова, 28** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Диспетчерская | Здание специализированное иного назначения | 765,1 кв.м | 400/С-4513 | Гродненская область, г. Гродно, ул. Пучкова, д. 28 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности:** | асфальтовое покрытие. |
| **Сведения о земельном участке:** | Площадь **0.1343 га** предоставлен продавцу на праве аренды по 03.11.2064 года, с установленным ограничением (обременением): охранная зона сетей и сооружений канализации, площадь 0.0130 га. |

**Начальная цена с НДС 20% – 2 028 500 000 белорусских рублей (снижена на 20%).**

*Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».*

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | 10 рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после проведения аукциона.

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 10.04.2015*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.05.2015 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **22.05.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |


# НЕ «РАЗЫШЛІСЯ» ТРАЛЕЙБУС З МАРШРУТКАЙ

**У Мінску тралейбус на прыпыначным пункце ўрэзаўся ў маршрутнае таксі.**

Адбылося гэта ўвечары. Па словах жанчыны-кіроўцы, пры пад'ездзе да прыпынку яна не змагла спыніцца, паколькі ў транспартнага сродку не спрацавалі тармазы. Яна паспрабавала аб'ехаць маршрутку, каб пазбегнуць сутыкнення, аднак размінуцца з ёй не атрымалася. Пасля сутыкнення з маршрутным таксі тралейбус ледзь не «ўскочыў» у слуп. У выніку дарожна-транспартнага здарэння пацярпела пасажырка мікрааўтобуса: жанчына атрымала ўдар нагі. Пасля агляду медыкамі ад шпіталізацыі тая адмовілася.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Блізкая ўлада

## ШУКАЙ ПРАЦУ НА «ПРАМОЙ ЛІНІІ»

**Для нядаўна прызначанага на пасаду першага намесніка старшыні Калінкавіцкага райвыканкама Сяргея КІРШЧЫНА гэта прамая тэлефонная лінія стала першай.**

Тры пытанні агучылі жыхары гэтага раёна. Першае тычылася рамонту аб'язной дарогі. Цяпер у Калінкавічах рамантуецца дарога праз чыгуначны пераезд, і таму актыўна стаў выкарыстоўвацца іншы шлях, дастаткова разбіты. Сяргей Міхайлавіч паведаміў, што ямачны рамонт камунальнікі пачалі рабіць у дзень, калі паступіла скарга ад людзей.

Дапамагчы разабрацца з прыватызацыяй жылля папрасілі з гаспадаркі «Якімавічы-агра».

— Гэтае пытанне трэба вывучыць больш дасканала, — гаворыць Сяргей Кіршчын. — Цяпер спецыяліст райвыканкама разбіраецца з дакументамі.

За жывёдавода адной з гаспадарак раёна хадайнічала сваячка, якая жыве ў Гомелі. Жанчына прасіла дапамагчы пляменніку-сіраце, які стаіць у чарзе на сацыяльнае жыллё, атрымаць яго як мага хутчэй.

— Не ўсё так проста, — кажа Сяргей Міхайлавіч. — У гаспадарцы існуе чарга на такое жыллё. Тым больш у маладога чалавека, які цяпер жыве з сястрой, ёсць стары бацькоўскі дом. У любым выпадку, мы будзем разбірацца ў сітуацыі больш падрабязна.

На «прамую лінію» ў Гомельскі аблвыканкам людзі тэлефануюць значна часцей, чым у райвыканкамы. Напрыклад, першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Максіменка ў суботу прыняў 40 званкоў. Ён кажа, што апошнім часам адсеяліся тэлефанаванні кансультацыйнага кшталту. Грамадзяне агучваюць канкрэтныя праблемы і просьбы, што дазваляе вырашаць іх якасна і аператыўна.

Сярод тэм, якія сталі заўважна больш актуальнымі — магчымасці працаўладкавання. Аляксандр Максіменка звязвае гэтую тэндэнцыю з прыняццем дэкрэта №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства».

— Некалькі званкоў паступіла ад будаўнікоў, якія раней працавалі на аб'ектах у Расіі. Усім, хто звярнуўся, мы прапануем вакансіі, якія адпавядаюць іх кваліфікацыі і спецыяльнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Зберагчы і захаваць

## «ЗЯЛЁНЫ» ПАДМУРАК ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

### Мінск прымае XIII Рэспубліканскі экалагічны форум

**З 19 па 22 мая ў беларускай сталіцы пройдзе самая маштабная экалагічная падзея краіны. Трэба адзначыць, што «зялёны» форум у Мінску адбудзецца ўпершыню. «Для нас гэта вялікая адказнасць, таму ўсе мерапрыемствы будуць на высокім узроўні, — адзначыла першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА. — Сělета да арганізацыі форуму падключыліся Міністэрства адукацыі, Беларуская гандлёва-прамысловая палата».**

Галоўнай тэмай стане экалагізацыя эканомікі Беларусі. На пленарным пасяджэнні выкажуць свае думкі на гэты конт намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл Русы, міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі, кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Майра Мора, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Санака Самарасінха, міністр аховы наваколля і рэгіянальнага развіцця Латвійскай Рэспублікі Каспар Герхардс. З прывітальным словам выступяць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел. «Для нашай краіны экалогія — гэта не самамэта, а неабходная ўмова для развіцця эканомікі», — рэзюмавала Ія Віталеўна.

Асноўная частка мерапрыемстваў форуму запланавана на 20 мая: акрамя пленарнага пасяджэння, таксама пройдуць дыскусіі па секцыях «Устойлівае развіццё і зялёная эканоміка», «Вада», «Глебы», «Экалагічная адукацыя». Дарэчы, адукацыйная пляцоўка прадстаўлена шырока і арыентавана ў першую чаргу на дзяцей і падлеткаў: для іх будуць арганізаваны майстар-класы, конкурсы. БРСМ прадставіць найлепшыя «зялёныя» праекты, прапанаваныя маладымі ў рамках праекта «100 ідэй для Беларусі». **Старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК** анансаваў конкурс графіці на экалагічную тэматыку.

«Удзельнікам гэтага «спаборніцтва» можа стаць кожны ахвотны, але толькі 5 найлепшых малюнкаў з'явяцца на сценах горада, — распавёў Сяргей Масляк. — Вопытныя графіцісты правядуць майстар-клас па расфарбоўцы сцяны непадалёк ад сталічнай гімназіі №19. Аўтары найлепшых малюнкаў будуць наносіць графіці на будынак, які знаходзіцца на перакрыжаванні Герасіменкі — Несцерава. Без падарункаў дакладна ніхто не застанецца».

На працягу 19—22 мая пройдзе міжнародная спецыялізаваная выстаўка «Зялёны Дом». На гэтай пляцоўцы ў наведвальнікаў будзе магчымасць азнаёміцца з інавацыйнымі тэхналогіямі ў галіне аховы наваколля. **Дырэктар унітарнага прадпрыемства «Белінтэрэкспа» Яўген УВЯДЗЕНСКІ** ў сваю чаргу заўважыў, што дагэтуль у краіне не існавала буйнога выставачнага праекта, цалкам прысвечанага экалогіі. «Беларуская гандлёва-прамысловая палата вырашыла даць штуршок і сабрала амаль усе кампаніі, якія працуюць у гэтай сферы, — патлумачыў Яўген Увядзенскі. — На выставе будуць прадстаўлены напрацоўкі 50 прадпрыемстваў. Альтэрнатыўная энергетыка, перапрацоўка адходаў, энергазберагальныя тэхналогіі, экалагічна чыстыя тавары, а дадаткова ландшафтны дызайн, азеляненне — усё звязана з экалогіяй. Таксама падчас правядзення «Зялёнага Дома» побач будзе працаваць сугучная выстаўка «Свет спорту і здароўя», якую раю ўсім наведаць. Сярод іншых там будуць прадстаўлены кампаніі па экатурызме. Увагу на мерапрыемствы абедзвюх выставак бясплатны, аднак папярэдне неабходна зарэгістравацца».

У дні правядзення форуму пройдзе і міжнародная канферэнцыя па біяразнастайнасці. Грамадскія арганізацыі «Зялёная сетка», «Цэнтр экалагічных рашэнняў» зладзяць канферэнцыю «Эка Горад», прысвечаную планаванню развіцця гарадоў Беларусі з улікам іх уздзеяння на наваколле. Такім чынам, форум пройдзе ў фармаце экалагічнага фестывалю, дзе кожны знойдзе сабе занятак па інтарэсах.

Ія Малкіна запрашае прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый, суб'ектаў гаспадарання прыняць удзел у мерапрыемствах форуму і наведаць выстаўку. «Разам мы зможам абмеркаваць, як далей развіваць эканоміку, пры гэтым захоўваючы багацці, дадзеныя нам прыродай», — падсумавала першы намеснік міністра.

Дарэчы, Выдавецкі дом «Звязда» пры падтрымцы ПРААН акурат для форуму выпусціў майскі выпуск часопіса «Родная прырода», які будзе цікавы як дарослым, так і дзецям.

**Кацярына РАДЗЮК**

# Тры шляхі для гультаёў...

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

На тэрыторыі раёна 15 сельскіх Саветаў. У цэнтральны населены пункт аднаго з іх — Вароны — журналіст выпраўляецца разам з участковым. На пасадзе ён каля пяці гадоў. Ахоўнік права на добрым рахунку ў начальства, ды і людзі яго паважаюць. А некаторыя нават баяцца...

— У Варонаўскім сельскім Савеце 13 населеных пунктаў. У вёсках і аграгарадках жывуць пастаянна прыкладна 1,5 тысячы чалавек. А ў дачны сезон у разы больш. Сярод іх прыкладна 40 чалавек, з якімі трэба пастаянна праводзіць прафілактычную працу. Гультаі ведаюць, што нічога не ўтояць ад мяне. Магу расказаць пра кожнага: хто чым «дыхае». Я ў курсе: ці «ўзяўся за розум», ці штодня ўсё больш сам сябе «цягне на дно», — распавядае **Дзмітрый ГЯНЮК, старшы ўчастковы інспектар Віцебскага РАУС, капітан міліцыі.**

Адзін участковы, зразумела, не можа нават пры ўсім жаданні перавыхаваць «дарослых дзяцей». Таму прафілактычная праца вядзецца ў цеснай сувязі з кіраўніцтвам сельвыканкама. Разам запэўніваюць, што жыць так нельга. Тых, на каго гэта не дзейнічае, па-добраму пужаюць сумнымі перспектывамі.



Яна кінула піць без кадзіравання.

— У нас вучыцца васьмігадовы хлопчык. Яго мама, вы будзеце здзіўлены, без кадзіравання кінула піць. Але зрабіла гэта толькі пасля таго, як пазбавілі бацькоўскіх праў. А да гэтага, згодна з дэкрэтам №18, забіралі ў яе дзіця. Прасіла вярнуць. Праз пару месяцаў пачала піць. Зноў дзіця забіралі. А ўжо як зразумела, што канчатковa застанецца без малога, дык зрабіла ўсё магчымае, каб сына вярнулі, — дадае **Генадзь ФІЛІПЕНКА, дырэктар Варонаўскай сярэдняй школы.**

## БУТЭЛЬКА «ЧАРНІЛА» І... ДЗІЦЯЧЫ АБУТАК

У будынку сельвыканкама ёсць дошка ганьбы і электронная «картатэка».

— Да кожнага стараемся знайсці індывідуальны падыход. І прыемна, калі былыя гультаі, тыя, хто мог стаць чужымі для родных дзяцей, гавораць пры сустрэчы «дзякуй». Магу паказаць тэматычны архіў. Вось — фота «эвалюцыі» людзей: якімі былі, калі злоўжывалі спіртным, якімі сталі пасля таго, як іх пачалі «апрацоўваць». Вось глядзіце: шпалеры паклеілі, бытавыя прыборы хатнія купілі, у халадзільніку хапае ежы, — дзеліцца вопытам **Юрый ОСІПАЎ, старшыня Варонаўскага сельвыканкама.**

> **«Да кожнага стараемся знайсці індывідуальны падыход. І прыемна, калі былыя гультаі, тыя, хто мог стаць чужымі для родных дзяцей, гавораць пры сустрэчы "дзякуй"».**

Некаторыя фота могуць стаць тэмай для плакатаў. Напрыклад, мяне «зачапіла» фатаграфія: пачак цыгарэт на ложку, побач — на падлозе — бутэлька віна і дзіцячы абутак. А на іншым здымку гультаі добраўпарадкаваннем займаюцца. Такая працатэрапія часам дае эфект.

— А кідаюць піць — і наваселлі спраўляюць, і гаспадарку заводзяць. Таму і ходзім па кватэрах, дамах, размаўляем, пераконваем. Адным гаворым адкрытым тэкстам, іншым — намякаем, што ў вас тры шляхі. Першы: жывеш па законах — і цябе ніхто не чапае. Другі: калі хочаш далей піць, ствараем такія ўмовы, пры якіх гэта будзе не ў радасць. І, калі ўжо такая пільная ўвага не паўплывае, ёсць трэці варыянт: адпраўка ў спецыяльны прафілакторый, або судзімасць, — працягвае Юрый Осіпаў.

У Варонаўскай сярэдняй школе вучацца дзеці тых, хто «завязаў» са спіртным. Тых жа няшчасных, бацькі якіх не змаглі «ўзяцца за розум», уладкоўваюць на выхаванне ў прыёмныя сем'і, інтэрнаты... Пры гэтым біялагічныя бацькі кампенсуюць дзяржаве ўсе выдаткі.



Дошка ганьбы ў сельсавеце.

## МАЛАЙЧЫНА, ЖАНЧЫНА!

Валянціна з вёскі Яроміна, пра якую згадваецца вышэй, можа з'явіцца прыкладам для тых, хто знаходзіцца на шляху выпраўлення.

— Працую на ферме вартаўніком. Каля 2 мільёнаў рублёў плацяць у месяц. Малавата. А дзе знайсці працу, каб больш? Мужчыну, напэўна, прасцей... Не, ездзіць у Віцебск, які недалёка, не хачу. Мне сына выхоўваць трэба, а не туды-сюды «катацца»... Як без дапамогі медыкаў кінуць піць? Галоўнае, каб жаданне было. А я вельмі хацела, каб Воўка (пра сына) быў са мной. У мяне яшчэ двое дарослых дзяцей. У старэйшага сына — дзяўчынкі, а ў дачкі — сын. Унучка, памятаю, усё пыталася, дзе яе дзядзька. У іх невялікая розніца ва ўзросце, а ён дзядзька (*смяецца*). Падтрымка старэйшых дзяцей таксама мне дапамагла пачаць новае жыццё... Ганаруся імі. Сын — добры гаспадар. Калі на ферме працавала, дык ён мне дапамагаў, там і кароў навучыўся даіць. Сёння ў яго дзве каровы. Ён і нявестку маю навучыў даіць (*смяецца*). І дачка ў мяне працавітая, — сціпла расказвае жанчына.

Яна нічога не ўтойвала са свайго цёмнага мінулага. Расказала пра тое, што хапала бутэлькі віна, каб напіцца. А з пахмелля не магла на працу выйсці. А неяк раз ад віна «дах паехаў», у выніку ў бальніцы ляжыла... Прызналася, што і цяпер залежная... толькі ад кавы. Выпілі разам. А побач быў яе «рыжык» — сын, які ласкава гладзіў кошку і трох кацянят.

> **«Першы шлях: жывеш па законах — і цябе ніхто не чапае. Другі: калі хочаш далей піць, ствараем такія ўмовы, пры якіх гэта будзе не ў радасць. І, калі ўжо такая пільная ўвага не паўплывае, ёсць трэці варыянт: адпраўка ў спецыяльны прафілакторый або судзімасць».**

Парада ад Валянціны тым, хто, як некалі і яна, знаходзіцца «на дне»: сам пакаждай змяніць сваё жыццё, не адмаўляйся ад дапамогі...

Для кантрасту заехалі з участковым да гультаёў. Дом на вуліцы Сонечная ў вёсцы Паляі адразу кінуўся ў вочы. Ды было з чым параўнаць, бо недалёка — шыкоўны катэдж.

— Мне 43 гады, дзяцей няма. Калісьці на ферме працаваў, потым да прыватніка ўладкаваўся лесніком. Пакуль што няма працы. Дапамагаю суседзям дровы нарыхтоўваць, сена... І даюць трохі на жыццё. А многа і не трэба. Ну, за святло заплаціць: а ў мяне толькі лямпачка адна, тэлевізар. На ежу зараблю. Разумею, што так жыць нельга. Чаму падлога крывая, што зачапіцца можна? Ну... Я звыклы, — адказвае на мае пытанні гаспадар дома.

А побач яго сяброўка, такая ж беспрацоўная, аматарка выпіць. Разам з міліцыянерам спрабавалі іх перавыхаваць. Хочацца верыць, што нашы намаганні не будуць марнымі. Хочацца, каб такіх герaінь, як Валянціна, у якой у жыцці цяпер усё добра, было больш...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Віцебскі раён.*

# СЭРЦУ МІЛЫЯ, БО НАРОДНЫЯ

**Жыццё можна спазнаваць з розных ракурсаў. Адзін з варыянтаў — праз народныя песні. Спяваючы іх і ўслухоўваючыся ў змест і інтанацыі выканаўцаў, расшыфроўваючы пасланне часоў, можна адкрыць новае ўспрыманне сябе і таго, што маеш. Менавіта народная творчасць ілюструе простую і такую важную ісціну: не губляючы набыткаў мінулага мы знаходзім саміх сябе. Ці не ў гэтым мудрасць? Фальклорная вандроўка здымачнай групы праграмы «Наперад у мінулае» ў вёску Курыцічы Петрыкаўскага раёна стала яшчэ адной ілюстрацыяй таго, як былое і сучаснасць спалучаюцца сёння ў глыбінцы.**

Увогуле любоў да песні — добрая нагода для людзей сабрацца разам, пагаварыць пра важнае зразумелай усім бацькоўскай «мовай». Калектыў народнага фальклорнага ансамбля «Спадчына» налічвае 15 чалавек, што складае палову ад той колькасці ўдзельнікаў, з якіх усё некалі пачыналася. Ансамбль «Спадчына» ўзнік у 1975 годзе, але тады гэта быў хор. У 1992-м калектыў стаў «народным». Сабрала ўсіх Тамара Хаменя. Яна і сёння з'яўляецца нязменным кіраўніком суполкі аматараў спяваць, акампануе ім на баяне.

— Іграю на гармоніку я з чацвёртага класа. У нашай сям'і спявалі ўсе. На любое свята родзічы і суседзі збіраліся ў нашай хаце і без песень не абыходзілася. А я заўсёды чакала, пакуль госці за стол сядуць, каб на гармоніку пайграць. Раней наогул больш весяліліся і па-іншаму, — расказвае пра свае адносіны з музыкай Тамара Мікалаеўна. — Пасля заканчэння школы дырэктар прапанаваў мне паехаць на курсы баяністаў. Скончыўшы вучобу там, я паступіла ў Культпрасвет у Магілёве. Працавала і вучылася завочна.

Першая песня, нібы прывітальнае слова, гучыць у выкананні самадзейных артыстаў. Акампанемент баяна і гукі бубна, на якім іграе адзіны мужчына ў калектыве, надаюць песням асаблівы каларыт. Гэтая не выключэнне...

*Ой, зялёна жыта, зялёна,*
*Харошыя госці ў мяне.*
*Ой, зялёна жыта ды авёс,*
*Харошыя госці Бог прынёс...*
*Ой, зялёна жыта, зялёна,*
*Харошыя госці ў мяне.*
*Ой, зялёна жыта, асака,*
*Харошыя госці здалёка...*

За гады свайго існавання калектыў паказаў сябе на шматлікіх канцэртных пляцоўках, кожны раз дэманструючы публіцы, як прыгожа можа гучаць народная песня. У гастрольнай біяграфіі — фестывалі «Кліч Палесся», «Берагіня», «Беларусь мая, песня» і многія іншыя, неадназова ансамбль быў госцем тэлевізійных праграм. На адной з іх паказвалі мясцовы абрад «Прыданне». У ім дэманструецца святкаванне другога дня вяселля. Калі ад маладой госці ідуць да маладога, то... нясуць з сабой елку. Каб дрэва трапіла па прызначаным адрасе, здаралася, неслі яго амаль што ўпотай. Потым хлопцы з боку маладога павінны былі занесці елку ў хату і паставіць на стол, каб ніхто не забраў. Усё дзейства суправаджалася песнямі. Як патлумачыла мне адна з удзельніц калектыву Вера Шэлег, спявалі прыкладна наступнае: *«Ой, ёлка, ёлка кучарава / У лесе расла — шуміла / Дарогаю шла звініла / На стале стала — заззяла / Усю сваю радзіначку сабрала / Уся мая радзіначка, расступіся / Ідзе Ганначка на пасад / Пасадзіла дружачак кругом сябе / Сама села вышэй усех / Бо мая головочка крашэ ўсех».*

Вера Цітаўна нарадзілася ў вёсцы Рубча, што за Петрыкавам. А пасля замужжа змяніла месца жыхарства. Яна з тых жанчын, каго можна лічыць шчаслівымі, бо яны спазналі радасць мацярынства. Вера Шэлег мае 6 дзяцей, 11 унукаў і 15 праўнукаў. У «Спадчыне» яна з ліку старажылаў. А яшчэ ў ансамблі спявае яе дачка і ўнучка. І калі загаварылі пра жыццёвыя будні, то самая маладая артыстка ў ансамблі — Наталля Шэлег — таксама падключылася да размовы:

— Часы зараз іншыя, але ўсё роўна трэба прыслухоўвацца да старэйшых. Паважаць іх і заўсёды ставіцца з любоўю. Такія людзі ніколі дрэннага не пажадаюць, яны перадаюць нам свой лепшы вопыт. Напрыклад, у сямейным жыцці, як вучылі мяне, дзяўчына павінна быць добрай гаспадыняй. Важна не забывацца пра цярпенне і ўзаемаразуменне ва ўзаемаадносінах, — дзеліцца Наталля. — На маё ўспрыманне жыцця ў пэўным сэнсе паўплывала сямейнае захапленне народнай песняй. Мне вельмі падабаецца спяваць з жанчынамі больш сталага ўзросту. Бо так я магу пераймаць багаты вопыт — і жыццёвы, і што датычыцца майстэрства спяваць. Ад'язджаеш у горад і пачынаеш сумаваць па вясковых буднях.


Ёсць бубен і баян — будзе і добры настрой.

Вёска Курыцічы, па словах старажылаў, была заснавана яшчэ да нападзення шведаў на Русь. А падчас нападзення ўсе жыхары былі знішчаны, жывымі засталіся толькі некалькі чалавек, якія схаваліся ва ўрочышчы Курчанка. Таксама праз вёску працякала рака з аднайменнай назвай, ад гэтага і пайшла назва Курыцічы. Спачатку на месцы сучаснай вёскі былі хутары, іх назвы ўтварыліся ад прозвішчаў людзей, якія тады засталіся жывымі: Корзун — Карзуны, Сапон — Сапонавічы, Мікіта — Мікіцічы, Лось — Лосевічы. Гэтыя найменні існуюць і сёння. Хутары хутка разрасталіся і з часам аб'ядналіся ў адну вёску. Яна знаходзілася між лясоў і балот. Школ тут не было. Але ў 1905 годзе было ўведзена хатняе навучанне. На той час у вёсцы знайшліся чатыры пісьменныя чалавекі. Пасля вайны 1812 года вёска належала пану Вярбоўскаму, а потым — пану Левяндоўскаму. І толькі пасля рэвалюцыі 1917 года тут з'явілася школа на 3 класы. Вялікая падзея адбылася ў 1929 годзе, калі праз вёску праклалі грунтавую дарогу, якая аб'яднала Петрыкаў і Капаткевічы. На сённяшні дзень вёска набыла статус аграгарадка, у якім налічваецца каля 80 жыхароў і ёсць умовы для камфортнага пражывання: школа, дзіцячы садок, крамы, пошта, ашчадная каса, амбулаторыя агульнай практыкі і Дом культуры. У клубе (так называюць у вёсках Дом культуры) мы і знаёмімся з творчасцю ансамбля «Спадчына». Як заўважаюць удзельнікі, назва гэтая ў пэўнай ступені сімвалічная, таму што любоў да народнага фальклору яны пераанялі ад сваіх родных і ў сваю чаргу імкнуцца рабіць усё магчымае, каб перадаць назапашанае багацце наступным пакаленням.

*Запрагу я пару коней.*
*Дай паеду у чыстэ поле,*
*Дай паеду у чыстэ поле.*
*Там дзяўчына проса поле.*
*Проса поле, грэчку вяжа,*
*Яна ж мне ўсю праўду скажа.*
*Ці мне цяпер жаніціся,*
*Ці па прэжней журыціся.*
*— Велю, мілы, жаніцца*
*Дай па прэжней не журыцца.*

Паспявалі ўсё: і працаваць, і гаспадарку весці, дзяцей гадаваць, і весяліцца. Вечарамі збіраліся па хатах, у каго большая, каб быў прастор і танцаваць, і спяваць, а нехта займаўся ў гэты час ткацтвам, вышыўкай альбо праў кудзелю ці лапці плёў. Калі электрычнасці яшчэ не было, такія вечары праводзілі пры лучыне. Гарманіста запрашалі з іншай вёскі. Днём яйкі збіралі ўпотай ад маці, каб вечарам музыканту аддаць — ён жа сям'ю карміў. І сядзелі да раніцы... А цяпер збіраюцца толькі ў клубе. «І часта чуюцца і спяваюцца тут песні родныя. Не забываюцца задушэўныя і лагодныя, сэрцу мілыя, бо народныя». Спяваць у ансамблі для ўсіх яго ўдзельнікаў вельмі важна. Не толькі таму, што так адчуваеш сябе патрэбным, не толькі ратуючыся ад адзіноты і надзённых клопатаў, але і для таго, каб захоўваць набыткі фальклорнага мінулага. Такім чынам зберагаецца асаблівая памяць пра тых, хто таксама жыў і любіў...

*Жыў у вёсачцы дзядок.*
*Ростам быў маленькі.*
*Ён жаніцца захацеў,*
*Голуб наш сівенькі.*
*Дзед , дзедачка, дзядок, які ты харошы!*
*Дзед, дзедачка, дзядок, жонкі любяць грошы.*
*Маладзіцу ён сустрэў,*
*І хадзілі чуткі,*
*Ён хацеў ёй падарыць*
*Сэрца і пачуцці.*
*Ён сустрэў яе ля крамы,*
*Лезе абдымацца.*
*— Ты машыну мне купі,*
*Перш чым цалавацца...*


Аб'яднаныя народнай песняй жанчыны з ансамбля «Спадчына».

Гісторыі змяняюць адна адну пад акампанемент баяна. Той самы выпадак, калі душа то разгортваецца, то сціскаецца ад спагады... Радаваць гасцей песняй для гэтых людзей — добрая традыцыя і жаданне падзяліцца чымсьці асабістым. Яны гэта робяць настолькі шчыра, што міжволі хочацца аднойчы вярнуцца сюды зноў...

**Алена ДРАПКО.**
**Фота аўтара.**

**P.S. Чарговая вандроўка з праграмай «Наперад у мінулае» і знаёмства з фальклорным народным ансамблем «Спадчына» вас чакае ў нядзелю, 24 мая, на тэлеканале «Беларусь 3»: зможаце пачуць іх жывое выкананне і стаць сведкамі, як госці выпуску прадстаўляць сваю версію аўтэнтычнай песні.**

## «ЭКСТРЫМ-РЭКОРДЫ ГІНЕСА» НА МАНЕЖЫ БЕЛДЗЯРЖЦЫРКА

**Беларускі дзяржаўны цырк запрашае наведаць новую праграму «Экстрым-рэкорды Гінеса». Прыхільнікаў цыркавога мастацтва чакае сапраўдны парад зорак сусветных цыркаў. Рэкардсмены, прадстаўнікі найстарэйшых цыркавых дынастый, уладальнікі самых высокіх узнагарод міжнародных фестываляў і конкурсаў упершыню прадставяць беларускаму гледачу агульную праграму экстрэмальных і неверагодных па прыгажосці нумароў.**



Беларускую публіку чакае відовішча ад найлепшых артыстаў. Тут будзе і фрыстайл на матацыклах, і дрэсіраваны павук тарантул, і шмат іншых захапляльных нумароў. Усё шоу складаецца з небяспечных трукаў, якія артысты будуць выконваць без страхоўкі. Варта адзначыць, што ніколі яшчэ ў нас не збіралася на арэне столькі рэкардсменаў. У гэтай праграме прадстаўлена 10 краін.

Трыумфальныя ўладальнікі самых высокіх узнагарод міжнародных цыркавых фестываляў і конкурсаў, адзіныя ў свеце выканаўцы чатырох сальта-мартале і трайнога піруэта ў паветры з Карэйскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі, прадставяць нумар «Паветраная трапецыя». А Бруна Меджалара з Італіі, які з'яўляецца ўладальнікам двух рэкордаў кнігі Гінеса, пакажа эфектны нумар «Змеі, дрэсіраваныя павукі-мясаеды, скарпіёны», дзе будуць гіганцкія пітоны, анаконды, скарпіёны і дрэсіраваныя павукі. Даніэль Дані і Эдзіна (Венгрыя, Партугалія) насуперак законам гравітацыі прадэманструюць цуды балансіроўкі на рэкорднай вышыні, большай за пяць метраў, у сваім нумары «Рола-Рола». Дарэчы, яны з'яўляюцца прадстаўнікамі адной з найстарэйшых цыркавых дынастый у Еўропе.

Чакае вас сустрэча і з Пітэрам Росендалем — бясспрэчным і непераможным каралём аднакалёснага веласіпеда ў нумары «Манацыклы». Ён прызнаны найлепшым у сваім жанры за ўсю гісторыю цырка і мае 51 рэкорд Гінеса. Нумар «Шоу гігальскіх мыльных пузыроў» падорыць чароўны, захапляльны атракцыён сусветнавядомых ілюзіяністаў і вынаходнікаў гіганцкіх мыльных пузыроў Біны і Яно Янг са Швейцарыі. На «Незвычайным балеце» зможаце пабываць разам з дрэсіраванымі ішакамі, якіх прадставіць у сваім нумары Айдын Ісрафілаў («Белдзяржцырк»). А яшчэ пад купалам выступіць «Незвычайны джаз-бэнд», дзе будуць дрэсіраваныя малпы Андрэя Цяплыгіна і Надзеі Красоўскай («Белдзяржцырк»). Пакажуць на манежы сябе і «Паветраныя гімнасткі ў коле» — нумар, у якім удзельнічаюць беларускія артысткі цырка Надзея Красоўская і Наталля Васільева.

І гэта далёка не ўсе сюрпрызы, якімі рыхтуюцца здзівіць у Беларускім дзяржаўным цырку гэтым летам. Бо ў праграме заяўлены таксама нумары «Паветраны шар» ад гімнастаў Даніэля Наша і Фларыяна Віюя (Італія, Швейцарыя), «Мотафрыстайл» з Францыі, дзе публіку чакае экстрэмальны палёт на матацыклах пад купалам. А ўсё прадстаўленне на манежы з вамі клоўны Сальвіні з італьянскай цыркавой дынастыі ў выкананні Паўліны і Франчэска Лураскі.

Калі плануеце цікава правесці час летніх канікул, то абавязкова паспяшайцеся набыць квіток на новую праграму «Экстрым-рэкорды Гінеса» «Белдзяржцырка», якая будзе доўжыцца да 2 жніўня.

**Алена ДРАПКО.**

## ПЯТНІЦА, 22 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.20** Зона Х.
**9.10 Меладрама «Мама, я жанюся!».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Вікторыя».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Маша ў законе!-2».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Дэтэктыў «Добрае імя».**
**17.30** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**17.55, 21.45** Нашы.
**18.10** Тайны следства.
**21.00** Панарама.
**21.55** Урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў XI Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня».
**0.45** Дзень спорту.
**0.55 Меладрама «Адшпіліце рамяні».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.35 Дэтэктыў «Метад Фрэйда».**
**10.15** Капейка ў капейку.
**10.50 Серыял «Косці».**
**12.45** Я хачу гэта ўбачыць!
**13.20** «Кітай: інструкцыя па вывучэнні».
**13.55 Серыял «Інтэрны».**
**15.00 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**15.55** Вось гэта дзіва!
**17.50 Серыял «Смерць у раі».**
**18.50** Кіпень.
**19.10 Баявік «Солт».**
**21.00** Цела чалавека.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.40** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**23.45** Рэпарцёр.
**0.30 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.30** «Дабрананак».
**8.00, 12.55, 19.00, 0.15** «Калейдаскоп».
**8.10** «Азёрная Адысея». Браслаўскае Паазер'е. Азёры Паўночнае і Паўднёвае Воласа.
**8.35, 18.10 «Сеткавая пагроза». Серыял.**
**9.30** «Рэчавы доказ». Сучаснік самой гісторыі.
**9.55 «У крузе першым». Драма, заключныя серыі.**
**13.05** «Сіла веры».
**13.35** «Аўтограф». Ансамбль песні з Мазыра «Сваякі».
**14.00** «Размаўляем па-беларуску».
**14.05 «Пётр І». Драма.**
**17.45** «Рэчавы доказ». Глобус Пятра Вялікага.
**19.10 «Турандот». Дэтэктыў.**
**20.45** «Калыханка».
**21.10** «Камертон». Мастак Вячаслаў Захарынскі.
**21.35 «Зімовы вечар у Гаграх». Камедыя.**



**23.00** «Гарыкі і чалавекі». Жыццё і творчасць Ігара Губермана. Фільм першы.

### БЕЛАРУСЬ 5

**5.05, 11.25, 20.50** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**7.30, 1.40** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футзал. Чэмпіянат свету. Беларусь — Бразілія.
**9.45** Футзал. Чэмпіянат свету. Беларусь — Аўстралія.
**13.25, 15.20** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ.
**17.15** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
**19.20** Свет англійскай прэм'ер-лігі.
**19.50** Фактар сілы.
**20.20** Піт-стоп.
**22.55** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
**0.45** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.05** «Вучыцца жыць».
**14.35** «Час пакажа».
**16.20 Камедыя «Формула кахання».**
**18.20** «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.05** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.20** «Што? Дзе? Калі? У Беларусі».
**0.50** «Вячэрні Ургант».
**1.40** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Д'ябал і Дэніэл Уэбстэр».**
**10.20** «Далёкія сваякі».
**10.40 «Салдаты 5». Серыял.**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Верны сродак».
**14.45, 23.00 «Водбліскі». Серыял. Заключныя серыі.**
**16.50** «Добры дзень, доктар».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Камедыя «Калі свякроў — монстр».**



**22.05** «Глядзець усім!».
**0.25** «Вялікая гульня». Покердуэль.
**1.10 Маст. фільм «Лінія».**

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00, 5.15** «Гісторыі з жыцця».
**9.30, 0.45 Маст. фільм «Розыгрыш».**
**11.15 Маст. фільм «Залезь на Месяц».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 2.30 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».**
**14.15, 3.25 Серыял «Джамайка».**
**16.25** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.20 Серыял «Участковы дэтэктыў».**
**19.25 Серыял «Гюльчатай».**
**22.40 Маст. фільм «Вій».**
**0.10** Ток-шоу «Высокія адносіны».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Код Кірыла. Нараджэнне цывілізацыі».
**12.20 Маст. фільм «Увага! Усім пастам...».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Код Кірыла. Нараджэнне цывілізацыі».
**18.00 Серыял «Апошні янычар».**
**18.55** «Асаблівы выпадак».
**21.00** «Загадка лёсу».
**22.00, 23.10** «Гумарына».
**0.00** «1/8 фіналу Міжнароднай лігі КВЗ».

### НТВ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.05** «Сонечна. Без ападкаў».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45** «Усё будзе добра!».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Маст. фільм «Крымінальная спадчына».**
**23.10 Трылер «Дар».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 14.00, 19.45, 21.00, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.45, 19.50 Серыял «Спіраль».**
**8.30, 18.40 Серыял «Цнатлівая».**
**9.25, 13.45, 15.50, 17.00, 19.30, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30** «Кінаблакнот».
**10.45 Прыгоды «Парыжскія таямніцы».**
**12.35 Серыял «Паклічце павітуху».**
**14.05 Серыял «Чорная страла».**
**16.30** «Адшукваецца адпачынак».
**17.10 Серыял «Дзясятае каралеўства».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Гульня Эндэра».**
**23.00 Серыял «Байкі са склепа».**
**23.30** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00, 5.20** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.30, 2.30** Скетчшоу «6 кадраў».
**8.30, 13.00** Серыял «Ералаш».
**9.00, 18.00** Скетч-шоу «Валера-TV».
**10.00** Серыял «Анжаліка 2».
**11.00** Камедыя «Карсіканец».
**14.00** Серыял «Дочкі-маці».
**15.00** «Давай развядзёмся!».
**16.00, 19.00** Серыял «Кахае не кахае».
**17.00, 5.00** «Лаві момант».
**20.00, 1.00** «Уральскія пельмені».
**21.10** Трылер «На мяжы».
**23.15, 2.00, 4.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00, 4.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** «Уральскія пельмені».
**3.00** «Кіно ў дэталях».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.20** «Прывід, які не вяртаецца». Маст. фільм.
**11.45** «Сяргей Каненкаў. Разец і музыка». Дак. фільм.
**12.25** «Пісьмы з правінцыі». Ардатаў (Рэспубліка Мардовія).
**12.50** «110 гадоў з дня нараджэння Леаніда Мартынава. «Я жыў. Я зваўся Геркулес». Дак. фільм.
**13.30** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
**14.00, 1.55** «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм.
**15.10** «Міхаіл Булгакаў. Чорны снег».
**15.40** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**16.20** Успамінаючы Мікалая Пастухова. «Эпізоды».
**17.00** Білет у Вялікі.
**17.40** XIV Маскоўскі Вялікодны фестываль. П. Чайкоўскі. Канцэрты № 2 і № 3 для фартэпіяна з аркестрам. Дзяніс Мацуеў, Валерый Гергіеў і сімфанічны аркестр Марыінскага тэатра.
**18.40** «Сусветныя скарбы культуры».
**19.15** «Юрый Нікулін. Класіка жанру».
**19.35** Да 110-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Шолахава. «Паднятая цаліна». Маст. фільм. 1-я серыя.
**21.05** «Астравы». Яўген Матвееў.
**21.45** Па слядах тайны. «Чалавек эпохі дыназаўраў».
**22.30** «Вяртанне». Дак. серыял.
**23.20** Да 70-годдзя Яўгена Кіндзінава. «Рамананс пра закаханых». Маст. фільм.
**1.30** «Цяп, ляп — маляры!», «Брэк!». М/ф для дарослых.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 10.00, 16.00, 18.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**6.50, 8.45, 9.40, 12.05, 12.30, 14.35, 15.40, 17.00, 17.35, 19.00, 20.50, 21.40, 23.00, 0.55, 2.35, 3.40, 5.00, 5.25, 5.50** Музычная настальгія.
**7.15** Маст. фільм «Рынг».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**11.00** «Я сама». Тэма: «У мяне п'е муж». 1995 год.
**12.00, 5.20** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**12.20** М/ф «Залатое кураня».
**13.00** Маст. фільм «Дзве версіі аднаго сутыкнення».
**17.30** М/ф «Мыйдадзір».
**18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962-ы. 1-я частка. 2010 год.
**19.20** Маст. фільм «Доўгія праводзіны».
**22.00** «Колба часу».
**23.30** «Атланты трымаюць неба». «Аднойчы раніцай рана».
**0.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Аляксандр Градскі. 2008 год.
**1.30** Маст. фільм «Іншаземка».
**5.40** М/ф «Як вожык і медзведзяня мянялі неба».

### EUROSPORT

**9.30, 13.00, 18.45, 22.00** Тэніс. Турнір АТР.
**10.30, 14.45, 18.30, 23.00, 1.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
**12.15, 19.45, 2.15** Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
**12.30** Тэніс. «Ралан Гарос».
**20.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для ігракоў (U-17). Фінал.
**0.00, 0.55** Конны спорт.
**0.05** Конны спорт. Кубак нацый Рым.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.35, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Дзякуй, што патурбавалі».
**8.25** Камедыя «Псіхі на волі».
**10.45** Камедыя «Зноў у гульні».
**12.15, 14.25, 15.15, 20.00, 21.40, 22.45, 0.50, 2.55, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**12.35** Камедыя «Халасцячкі».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «All inclusive, ці Усё ўключана!».
**18.20** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».



**20.20** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**23.10** Камедыя «Усё ўключана 2».
**1.15** Камедыя «Мільён на Каляды».
**4.00** Камедыя «Канікулы ў Грэцыі. Усё ўключана».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.15** «Доктар І...».
**7.45, 18.45, 1.05** «Эзель». Серыял.
**9.25, 3.40** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.10, 17.45** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.05, 16.50** «Сакрэты экстрасенсаў». Дак. серыял.
**13.00** «Неспакойны ўчастак». Серыял.
**13.55** «Простыя складанасці».
**14.25, 0.15** «Управа». Серыял.
**15.20, 22.50, 2.50** «Зорныя гісторыі».
**16.20, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**20.50** Камедыя «Добрай раніцы».
**23.45** «Гісторыі выратавання».

### ТБ1000

**5.30** Трылер «Дар».
**7.25** Казка «Залаты Компас».
**9.25** Драма «Перапыненае жыццё».
**11.40** Камедыя «Атэль раманатычных спатканняў».
**13.15, 0.00** Камедыя «Пазбаўце нас ад Евы».
**15.00** Драма «Басанож па смажжах».
**16.45** Меладрама «Зараз самы час».
**18.25** Баявік «Агент пад прыкрыццём».
**20.00** Драма «Вялікія надзеі».
**22.10** Трылер «Пакой страху».
**1.50** Трылер «Добры доктар».
**3.30** Драма «Легенды восені».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Драма «Жанаты халасцяк».
**7.50** Казка «Рэальная казка».
**9.40** Камедыя «Мужчына ў маёй галаве».
**11.40** Трылер «Апошні ўікэнд».
**13.15** Фантастыка «Пісьмы мёртвага чалавека».
**14.45** Драма «Паршывыя авечкі».
**16.50** Камедыя «Кур'ер з «Раю».
**18.30** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**20.20** Баявік «Антыкілер».
**22.20** Меладрама «Паралельныя светы».
**23.55** Драма «Снайпер 3: Герой супраціўлення».
**2.10** Камедыя «Двайная прапажа».
**4.20** Камедыя «Бакенбарды».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 11.40** Мегазаводы.
**6.45, 13.15, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Зрабі або памры.
**7.55** Шаша праз пекла.
**8.40** Дзікі тунец.
**9.25, 14.00, 19.30** Дзікая будоўля.
**10.55** Аўта-SOS.
**12.30, 17.55, 21.00, 0.45, 3.45** Золата Юкана.
**15.35** Тайна марскога д'ябла.
**16.20** Дзікая прырода Амерыкі.
**17.10** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**18.40, 21.45, 1.30, 4.30** Космас. Прастора і час.
**22.30** Зорная гутарка.
**23.15** Расследаванні авіякатастроф.
**0.00** Эвакуацыя Зямлі.
**3.00** Апошнія тайны Трэцяга рэйха.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Эфект Карбанара.
**9.40, 13.50** Мотабітва.
**12.10, 18.00** Бітва за нерухомасць.
**13.00, 0.40, 6.25** Акварыумны бізнес.
**14.40, 5.35** Разбуральнікі легенд.
**16.20, 4.00** Фабрыка ўнікальных аўто.
**17.10, 4.45** Махінатары.
**18.50** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**19.40** Залатая ліхаманка.
**22.10** Неверагодны хмарачос.
**23.00** Сібірская рулетка.
**23.50** Аляска: апошні рубеж.
**1.30, 7.10** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.
**3.10** Паляўнічыя на склады.

## СУБОТА, 23 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.50** Існасць.
**7.15 Меладрама «Білет на дваіх» .1 я і 2-я серыі.**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Буйным планам.
**9.40, 1.00 Серыял «Кухня».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.25** Дача.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**12.50** Кулінарная дыпламатыя.
**13.25** Выхад ёсць.
**14.00 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30 Меладрама «Вечная казка».**
**17.30 Дэтэктыў «Неверагодныя прыгоды Аліны». 1-я і 2-я серыі.**
**21.00** Панарама.
**22.00** Міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне 2015». Фінал.
**1.50** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**6.55** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**7.45** Беларуская кухня.
**8.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.15** «Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна».
**10.45** Анімацыйны фільм «Сезон палявання».
**12.10, 21.30** Тэлебарометр.
**12.15** Капейка ў капейку.
**12.55** «Бітва экстрасэнсаў. Барацьба кантынентаў».
**15.00** Вось гэта дзіва!
**15.35 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**17.20 Дэтэктыў «Вір чужых жаданняў». 1-я — 4-я серыі.**
**20.55** Цела чалавека.
**21.35** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**21.40 Камедыя «Не жартуйце з Zоханам!»**
**23.45** «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
**0.30** «Зразумець і абясшкодзіць».

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.55, 12.10, 16.40, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.05 «Турандот». Дэтэктыў.**
**9.40** «Камертон». Мастак Вячаслаў Захарынскі.
**10.05 «На вайне як на вайне». Драма.**
**11.30** «Нябачны фронт». Снайпер Марыя Галышкіна.
**11.55** «Лыжка для салдата». М/ф.
**12.20 «Мянялы». Камедыя.**



**13.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**14.15 «Хуткі і мёртвы». Вестэрн.**
**16.00** «Раман з лёсам». Пані Малкіна — чэшская Ранеўская.
**16.50 «Грошавы цягнік». Баявік.**
**18.35 «Па сямейных абставінах». Камедыя.**
**20.45** Калыханка.
**21.00 «Навічок». Камедыя.**
**22.40** «Подых струн». Музычная праграмма. Госць: Аляксандр Апановіч.
**23.20** «Гарыкі і чалавекі». Жыццё і творчасць Ігара Губермана. Фільм першы.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 0.30** PRO спорт. Навіны.
**7.45, 18.05** Сэлфі.
**8.00** Свет англійскай прэм'ерлігі.
**8.25** Піт-стоп.
**8.55** Гандбол. Кубак Беларусі. Фінал. «БГК імя Мяшкова» — СКА (Мінск).
**10.55** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч у адказ. «Рэал» — «Ювентус».
**14.55** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Віцебск» — «Дынама» (Мінск).
**16.55** Формула-Е. Гран-пры Германіі.
**18.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.55** Валейбол. Адборачны матч ЧЕ-2015. Плэй-оф. Жанчыны. Першы матч. Украіна — Беларусь.
**21.00** Спартыўная гімнастыка. Анадыя.
**23.35** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**13.05** «Янтарны пакой». Фільм 1-ы.
**14.05 Серыял «Ой, ма-мачкі!».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Барахолка».
**17.15** «100 мільёнаў».
**18.10** «Акадэмія талентаў. Курс чацвёрты».
**21.05 Меладрама «А вось і яна».**
**22.50** «Легенды Live». «Чайф».
**23.30 Камедыя «Міс Сакавік».**

### СТБ

**6.15 Камедыя «Калі свякроў — монстр».**
**8.00** «Тайны свету».
**9.00** «Разумней не прыдумаеш».
**10.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Салдаты». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.55 «NEXT 2». Серыял.**
**15.20** «На 10 гадоў маладзейшы».
**15.55** «Вялікі горад».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Дарагая перадача».
**17.20 Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Вяртанне Супермена».**
**22.50** «На тым жа месцы ў той жа час».
**0.05** «Масква. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00, 8.40** М/ф.
**6.30, 3.55 Маст. фільм «Сэрцы чатырох».**
**8.10** «Саюзнікі».
**9.05** «Эксперыментатары».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15 Маст. фільм «Вій».**
**11.40, 0.20 Серыял «Копі цара Саламона».**
**15.15** «Культпрасвет».
**16.15 Серыял «Варачка 2».**
**22.20 Маст. фільм «Дом на абочыне».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00 «Ха». Маленькія камедыі.**
**7.30** «Планета сабак».
**8.05, 11.10 Маст. фільм «Пацалунак лёсу».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.40** «Суботнік».
**12.20 Маст. фільм «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».**



**14.15 Маст. фільм «У чаканні вясны».**
**16.05** «Утаймавальнікі гуку».
**17.10** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40 Камедыя «Хачу замуж».**
**22.30 Маст. фільм «Застань-**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «ППС».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**11.05** «Паедзем, паядзім!».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Другая сусветная. Вялікая Айчынная». «Невядомы Гітлер. Асабісты даклад для Сталіна».
**14.20 Серыял «Каця».**
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**22.05** «Ты не паверыш!».
**23.00 Маст. фільм «Вяртанне».**
**0.40** «Ахтунг, русіш!».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.55, 19.00, 20.55, 23.35** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**10.45 Серыял «Цнатлівая».**
**11.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**11.40, 13.55, 15.50** «Хатняя крама».
**11.55 Трылер «Прывідны гоншчык».**
**14.00 Трылер «Прывідны гоншчык-2».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Трагікамедыя «Пашпарт».**
**18.15 Серыял «Месца злачынства Маямі».**
**19.05 Меладрама «Фанфан — водар кахання».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.10 Трылер «Ізгой».**
**23.40** «Хобі TV».

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00** Серыял «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 2.00** «Турбаміксер».
**12.00** Трылер «На мяжы».
**14.05, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Хатняя кухня».
**15.00, 5.00** Серыял «Калыска над безданню».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Сямейны бізнес».
**20.30** Меладрама «Мільянер з трушчоб».
**0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**0.30, 4.30** «Лаві момант».
**1.00** «Нерэальная гісторыя».
**1.30** Скетчком «Студэнты».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «85 гадоў з дня нараджэння Віталя Вульфа. «Мой сярэбраны шар. Ігар Ільінскі».
**10.50** «Свята святога Ёргена». Маст. фільм.
**12.15** «Валянціна Сярова».
**12.55** «Дзяўчына з характарам». Маст. фільм.
**14.20** «Мой сярэбраны шар. Леанід Уцёсаў».
**15.05** «Вясёлая моладзь». Маст. фільм.
**16.40** «Мой сярэбраны шар. Фаіна Ранеўская».
**17.25** «Падкідыш». Маст. фільм.
**18.35** «Рамантыка рамансa». «Пра каханне».
**19.35** «Паднятая цаліна». Маст. фільм. 2-я серыя.
**21.10** «Астравы». Пётр Глебаў.
**21.50** «Белая студыя».
**22.30** Да 75-годдзя з дня нараджэння Іосіфа Бродскага. «Вяртанне». Дак. серыял.
**23.05** Кіно на ўсе часы. «Чорны Пётр». Маст. фільм.
**0.40** Дзмітрый Паўцоў. Канцэрт у Маскоўскім дзяржаўным тэатры эстрады.
**1.30** «Трус з капуснага агарода». «Заяц, які любіў даваць парады». М/ф для дарослых.
**1.55** Па слядах тайны. «Чалавек эпохі дыназаўраў».
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 20.40** «Прэс-экспрэс». 1994 год.
**6.05, 6.30, 8.35, 9.40, 11.00, 13.05, 14.50, 15.40, 17.00, 17.35, 19.00, 20.10, 20.45, 21.40, 23.10, 23.40, 0.50, 2.45, 3.40, 5.40** Музычная настальгія.
**6.20** М/ф «Залатое кураня».
**7.00** Маст. фільм «Дзве версіі аднаго сутыкнення».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 0.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.30** М/ф «Мыйдадзір».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1962-ы. 2010 год.
**13.20** Маст. фільм «Доўгія праводзіны».



**16.00** «Колба часу».
**17.30** «Атланты трымаюць неба». «Адночы раніцай рана».
**19.50** М/ф «Шэрая шыйка».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Белы выбух».
**23.30** М/ф «Сястрыца Алёнка і братка Іванка».
**1.15** Маст. фільм «Рынг».
**5.00** «Я сама». Тэма: «У мяне п'е муж». 1995 год.

### EUROSPORT

**9.30, 13.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы для ігракоў (U-17). Фінал.
**10.30, 14.30, 18.30, 2.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
**12.00** Веславанне на байдарках і каноэ. Кубак свету.
**13.15, 21.45, 2.45** Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
**18.45, 20.15** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**20.00** Тэніс.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Суперкамбат. Серыя WGP.
**0.00** Футбол. Старэйшая ліга футбола. Toronto FC (Канада) — Portland Timbers (ЗША).

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.40, 22.00, 3.10** Серыял «Былыя».
**6.45** Камедыя «Псіхі на волі».
**8.25** Камедыя «Халасцячкі».
**10.45** Камедыя «All inclusive, ці Усё ўключана!».
**12.30** Меладрама «Каханне і іншыя катастрофы».
**14.10** Камедыя «Востраў скарбаў».
**16.00** Камедыя «Усё ўключана 2».
**18.25** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**20.00, 22.45, 0.55, 2.50, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**20.20** Камедыя «Будзьце як дома».
**23.10** Камедыя «Два светы».
**1.15** Камедыя «Зноў у гульні».
**4.00** Камедыя «Мільён на Каляды».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.30, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**11.25** «Prокіно».
**11.35** «Хронікі маскоўскага быту».
**12.25** «Гісторыі выратавання».
**13.00, 1.30** Серыял «Трава пад снегам».
**16.20** М/ф «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік».
**17.35, 4.30** «Без тэрміну даўнасці».
**18.30** «Знайсці Згубляшку». Дак. фільм.
**20.00** Меладрама «Лера».
**21.55** Трылер «Чалавек-воўк».



**0.00** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**5.50** Трагікамедыя «Гуманітарныя навукі».
**7.30** Драма «Вялікія надзеі».
**9.35, 3.40** Камедыя «Я заўважу».
**11.15** Драма «Легенды восені».
**13.25** Драма «Тэрэза Д».
**15.20** Камедыя «Гамбіт».
**16.50** Драма «Разня».
**18.10** Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
**20.00** Драма «Блізкасць».
**21.45** Драма «Ромавы дзённік».
**23.55** Драма «Нешта не так з Кевінам».
**2.00** Камедыя «А вось і Полі!».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Набожная Марта».
**8.50** Камедыя «Добры дзень, мы ваша дах».
**10.30** Драма «Дом ветру».
**12.20** Камедыя «Вечары на хутары ля Дзіканькі».
**13.35** Драма «Гутарка».
**14.55** Трылер «Самнамбула».
**16.20** Баявік «Брат».
**18.05** Баявік «Брат 2».
**20.20** Меладрама «Начны таверны агеньчык».
**22.20** Драма «Люстэркі».
**0.50** Драма «Дом».
**3.10** Меладрама «Улетку я аддаю перавагу вяселлю».
**4.50** Фантастыка «Пісьмы мёртвага чалавека».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 9.25, 17.10** Навуковыя недарэчнасці.
**7.10** Займальная навука.
**8.40** Паядынак непераможных.
**12.30** Больш чым фокусы.
**13.15** Космас. Прастора і час.
**14.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**15.35** Дзікая прырода Амерыкі.
**16.20** Мядзведзі вострава Страху.
**21.00, 0.00, 3.00** Эвакуацыя Зямлі.
**21.45, 0.45, 4.30** Прадвеснікі Апакаліпсісу.
**22.30, 1.30, 5.15** Апакаліпсіс Мая.
**23.15, 2.15** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 17.10, 5.35** З любові да машын.
**8.50, 15.30** Гаражная каманда.
**9.40, 16.20, 0.40, 6.25** Махінатары.
**10.30** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**11.20** Залатая ліхаманка.
**13.00, 4.00** Скарбы з каморкі.
**13.50, 23.50** Склады: бітва ў Канадзе.
**14.40** Экстрэмальныя калекцыянеры.
**18.00** Дамы на дрэвах.
**18.50** Ванная пад ключ.
**19.40** Акварыумны бізнес.
**20.30** Эфект Карбанара.
**23.00** Зорнае выжыванне.
**1.30** Востраў.
**2.20** Хуткія і гучныя.
**3.10** Неверагодны хмарачос.
**4.45** Як гэта ўстроена?
**5.10** Як гэта зроблена?
**7.10** Беар Грылс: кадры выратавання.

## Сеціва

# ІНТЭРНЭТ ЗАМЯНІЎ СЕКС

**Як высветлілі вучоныя, гетэрасексуальныя пары Вялікабрытаніі 25 гадоў таму займаліся сексам, у сярэднім, каля пяці разоў на месяц, а цяпер гэтая колькасць скарацілася да трох (піша The Independent). Эксперты мяркуюць, што прычына падобных змен — у з'яўленні інтэрнэту.**



Прафесар Дэвід Шпігельхальтэр з Кембрыджскага ўніверсітэта выявіў, што з развіццём высокіх тэхналогій людзі паступова губляюць цікавасць да палавога жыцця. Па яго назіраннях, у 2000 годзе брытанцы ў сярэднім займаліся сексам чатыры разы на тыдзень, а праз 15 гадоў гэты паказчык упаў. У праграме для жанчын на радыё ВВС ён падкрэсліў, што не ведае дакладна прычыны такой тэндэнцыі, але мяркуе, што са з'яўленнем мабільных гаджэтаў людзі сталі менш часу аддаваць адно аднаму.

Прафесар таксама прывёў звесткі са сваёй кнігі «Секс у лічбах», якія паказалі, што мужчыны схільны перацэньваць колькасць сваіх палавых партнёрак, а жанчыны — недаацэньваць. На думку Шпігельхальтэра, жанчыны, верагодна, схільны забывацца пра некаторыя, непрыемныя для іх, адносіны.

# ЗДРАДЫ НА ЭКСПАРТ

**Канадскі сайт знаёмстваў, які спецыялізуецца на пазашлюбных сувязях, плануе арганізаваць свае акцыі ў Лондане.**



Сэрвіс анлайн-знаёмстваў Ashley Madison, што прызначаны для тых, хто хоча здрадзіць мужу або жонцы, хоча адшукаць сродкі для таго, каб задаволіць попыт на свае паслугі, які расце. На продажы каштоўных папер сайт плануе прыцягнуць 200 мільёнаў долараў. Нягледзячы на тое, што 50% кліентаў сайта жывуць у Паўночнай Амерыцы, спроба размясціць каштоўныя паперы ў 2010 годзе ў Таронта праваліласяя. Кіраўнік аддзела па міжнародным развіцці кампаніі Крыстафер Крэмер упэўнены, што «толькі ў Еўропе, з яе ліберальным стаўленнем да здрад, у сайта ёсць шанц паспяхова размясціць свае акцыі». У 2014 годзе продажы сайта шлюбных здрад дасягнулі 115 мільёнаў долараў, што ў чатыры разы вышэй, чым у 2009 годзе. Улічваючы папулярнасць паслуг кампаніі, якая пастаянна расце, кіраўніцтва вырашыла скарыстацца гэтым і выпусціць акцыі ў Еўропе.

Сайт знаёмстваў Ashley Madison створаны ў 2002 годзе. Ідэя анлайн-сэрвісу ў тым, каб дапамагчы завесці рамантычныя адносіны на баку людзям, якія знаходзяцца ў шлюбе. У прыватнасці сайт прапаноўвае нават паслугу пошуку партнёркі на час адпачынку або камандзіроўкі. Жанчынам дазволена карыстацца сайтам бясплатна, а вось кліенты мужчынскага полу павінны плаціць.

**Іван КУПАРВАС.**

■ У свеце жывёл

# ЗААПАРК «СЕМ ЗОРАК»

**Пераначаваць побач з ільвом — афіцыйна і бяспечна**

**Калі ў дзяцінстве вы зачытваліся апавяданнямі пра жывёл і марылі хоць дзянёк пажыць у джунглях, як Маўглі, у нас для вас добрая навіна: у Аўстраліі адкрыўся гатэль, у якім пастаяльцы могуць пераначаваць у кампаніі самых сапраўдных дзікіх звяроў!**



Гатэль Jamala Wildlife Lodge знаходзіцца побач са знакамітым Нацыянальным заапаркам і акваркам Аўстраліі, што ў Канберы. Пастаяльцы гэтай гасцініцы на 18 нумароў могуць выбіраць, побач з кім з прадстаўнікоў дзікай прыроды яны хочуць правесці выхадныя: ёсць нумары, дзе адна са сценак выходзіць у акіянарыум, а ёсць для тых, хто таемна заўсёды марыў прыняць ванну ў кампаніі бурага мядзведзя. Гасцініца вельмі папулярна ў саміх аўстралійцаў: мяркуючы па шматлікіх водгуках на розных сайтах для падарожнікаў, па ўражаннях, адпачынак тут — альтэрнатыва афрыканскаму сафары, але без страляніны і забойстваў.

Асаблівая шмат станоўчых водгукаў прысвечана мясцоваму бару, дзе можна выпіць віна (яго, як і кухню, пастаяльцы гатэля таксама вельмі хваляць) у кампаніі белых ільвоў. Прычым, мяркуючы па запэўненнях уладальнікаў гатэля, гэта абсалютна бяспечна і для наведвальнікаў (шкло выключае магчымасць пранікнення жывёл у памяшканне, дзе жывуць і харчуюцца госці), і для жывёл (іх і так нядрэнна кормяць).



Гатэль люксавы, яго ўзровень пазіцыянуецца як той, што перавышае «пяць зорак», і знаходжанне тут каштуе нятанна. Напрыклад, ахвотныя пасядзець у кампаніі «зашкляных» ільвоў або, скажам, акул, могуць забраніраваць нумар ад 1000 долараў у суткі (максімальнае размяшчэнне — двое ў нумары) да 1300 (гэта ўжо на чатыры чалавекі). Сума немаленькая, але калі падзяліць яе на кампанію і ўлічыць, што ў кошт нумара ўключаны таксама харчаванне (сняданак і абед), віно (уключаючы міні-бар), а таксама тур па заапарку з кармленнем жывёл — атрымліваецца ўжо менш палахлівая лічба. Увогуле, аматарам арганізаваць сабе арыгінальны адпачынак гатэль можна рэкамендаваць смела. Калі раптам выпадкова апынецеся ў Аўстраліі — абавязкова зазірніце! У рэшце рэшт, некаторыя праводзяць аналогію, што гэта амаль як пабываць унутры фільма «Джуманджы», толькі бяспечна.



## НЯДЗЕЛЯ, 24 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.05** **Меладрама «Білет на дваіх». 3-я і 4-я серыі.**
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Дзень Святой Троіцы.
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал».
**9.40, 0.30** **Серыял «Кухня».**
**10.45** «Пра ежу!».
**11.20** XXL WOMAN TV.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** Зона Х. Вынікі тыдня.
**13.05** Тайны следства.
**13.40** Каробка передач.
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Твой горад.
**15.30** **Меладрама «Багатая Маша-2».**
**17.15** Eurovision. Вынікі тыдня.
**17.35** **Дэтэктыў «Неверагодныя прыгоды Аліны». 3-я і 4-я серыі.**
**21.00** Галоўны эфір.
**21.55** Навіны надвор'я.
**22.15** Дыялогі пра цывілізацыю.
**22.45** **Меладрама «Мама, я жанюся!».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**7.55, 21.45** **Серыял «Шчаслівыя разам».**
**9.45** Турыст.
**10.30** Хачу ў тэлевізар!
**10.35, 20.05** Тэлебарометр.
**10.40** «Fitnews».
**11.20** Ваша лато.
**11.50** Латарэя «Пяцёрачка».
**12.00** «Кітай: інструкцыя па выбучэнні».
**12.35** Я хачу гэта ўбачыць!
**13.05** «Зразумець і абясшкодзіць».
**13.40** **Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**15.40** **Баявік «Солт».**
**17.30** «Comedy woman».
**18.35** Ікра.
**19.15** Суперлато.
**20.40** Кіпень.
**21.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**23.40** Вышэй за дах.
**0.10** **Камедыя «Не жартуйце з Зоханам!».**



### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.05, 17.15, 0.50** Калейдаскоп.
**8.10, 13.15, 17.25, 1.00** «Размовы пра духоўнае».
**8.20** «Культурныя коды». Дак. фільм.
**8.45** **«Па сямейных абставінах». Камедыя.**
**11.00** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Аляксандр Апановіч.
**11.35, 14.15** «Размаўляем пабеларуску».
**11.45** «Наперад у мінулае».
**12.10, 21.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**13.25** «Музеі Беларусі». Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь.
**14.20** «Пётр Конюх». Жыццё і творчасць беларускага спевака.
**14.50** **«Зімовы вечар у Гаграх». Камедыя.**
**16.15** «Свінг белых начэй». Гала-канцэрт Пецярбургскага фестывалю джазу.
**17.35** **«Лёс чалавека». Драма.**
**19.10** **«Ярасла́ўна, каралева Францыі». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**21.55** Канцэрт Макса Пакроўскага і групы «Ногу свело».
**23.20** «Культпрасвет».
**0.00** «Гарькі і чалавекі». Жыццё і творчасць Ігара Губермана. Фільм другі.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.55** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. ФК «Віцебск» — «Дынама» (Мінск).
**9.45** Валейбол. Адборачны матч ЧЕ-2015. Плэй-оф. Жанчыны. Першы матч. Украіна — Беларусь.
**11.50** Баскетбол. НБА. Плэй-оф.
**13.55, 22.55** Спартыўная гімнастыка. Анадыя.
**16.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.55** Футбол. Кубак Беларусі. Фінал. БАТЭ (Барысаў) — «Шахцёр» (Салігорск).
**18.55** Валейбол. Адборачны матч ЧЕ-2015. Плэй-оф. Жанчыны. Матч у адказ. Украіна — Беларусь.
**21.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Матч апошняга тура.

### АНТ

**7.00** «Нядзельная раніца».
**8.00, 9.00, 16.00** Нашы навіны.
**9.05** «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
**9.20** **Маст. фільм «Кур'ер».**



**11.00** «Брэйн-рынг».
**12.10** «Горка!».
**13.00** «Янтарны пакой». Фільм 2-і.
**14.00** **Серыял «Ой, ма-мач-кі!».**
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.15** «Кропля ў кроплю!».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вызваленая Еўропа».
**22.00** **Камедыя «Сэрцаед».**
**23.50** **Фантастыка «Дзень, калі Зямля спынілася».**

### СТБ

**6.05** **«Студэнты International». Серыял.**
**7.35** «Скардзіцца дазваляецца».
**7.55, 16.50** «Аўтапанарама».
**8.20** **Маст. фільм «Вяртанне Супермена».**
**11.00** «Вялікае снеданне».
